УДК 008:316.7

# ПАТЭНЦЫЯЛ КАНЦЭПЦЫІ «ЛОКУС КАНТРОЛЮ» ДЛЯ КАНСТРУЯВАННЯ КУЛЬТУРНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ

***А. Д. Крывалап,*** *кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны разгляду пытанняў магчымасці выкарыстання канцэпцыі «локус кантролю» ў працэсе пабудовы культурнай ідэнтычнасці ў сучасных сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах. Апорнай кропкай з’яўляецца канцэпцыя «знешняга і ўнутранага локус кантролю», якую прапанаваў сацыяльны псіхолаг Д. Ротэр. Локус кантролю разглядаецца як вынік сацыяльнага навучання ў працэсе інкультурацыі, а таксама як магчымасць кантролю над уяўленнямі будучыні, дакладней, пра працу з ёй. Працэс пабудовы ідэнтычнасці не можа падмяняць сабой мэту, дзеля якой людзі ўключаюцца ў яго. Але тут не ідзе размова пра магчымасць кантраляваць будучыню. Аўтар імкнецца ў першым набліжэнні акрэсліць магчымасці выкарыстання сацыяльна-псіхалагічнай канцэпцыі «локуса кантролю» падчас даследаванняў культурнай ідэнтычнасці.

**Ключавыя словы:** культурная ідэнтычнасць, локус кантролю, сацыяльнае навучанне, культуралогія.

# POTENTIAL OF THE LOCUS OF CONTROL CONCEPT FOR THE CONSTRUCTING CULTURAL IDENTITY

***A. Krivolap,*** *PhD in Cuturology, Associate Professor of the Department of Culturology of the Educational Establishment «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstrtact.** The text is devoted to the possibility of using the concept of locus of control in the process of cultural identity construction in modern socio-humanitarian disqource. The point of reference is the concept of external and internal locus of control proposed by the social psychologist J. Rotter. Locus of control is seen as a result of social learning in the process of enculturation, as well as the ability to control perceptions of the future, or rather to work with it. The process of identity construction cannot replace the goal for which people are involved. But it is not about the ability to control the future. This article attempts to outline, as a first approximation, the possibilities of using the social-psychological concept of locus of control in the study of cultural identity.

**Keywords:** cultural identity, locus of control, social learning, cultural studies.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праблема ідэнтычнасці цвёрда прапісалася ў прыярытэтныя тэмы сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Існуе вялікая колькасць вынікаў даследаванняў адносна таго, дзе і як ствараецца ідэнтычнасць, хто з'яўляецца яе носьбітам, а таксама пра крызіс ідэнтычнасці. Пры гэтым па-за ўвагай можа быць пакінута пытанне крыніцы матывацыі атрымання ідэнтычнасці для індывіда. Можна сказаць, што патрэба ў сацыялізацыі і неабходнасць мець зносіны з іншымі людзьмі не заўсёды з'яўляецца пераканаўчым адказам на гэтае пытанне. Зразумела, што яно не абмяжоўваецца выключна сферай культуралогіі, але і заходзіць на «поле» псіхалогіі. Чаму, калі ў асобных індывідаў ці сацыяльных груп паўстае патрэба ў ідэнтыфікацыі, то частка з іх ахвотна пагаджаецца на прапанаваныя знешнія мадэлі і вызначэнні, а іншыя імкнуцца да самавызначэння і самаапісання? Магчымым адказам на гэта пытанне будзе разгляд з пазіцыі культуралогіі магчымасці выкарыстання канцэпцыі «локус кантролю» ў працэсе канструявання культурнай ідэнтычнасці.

У 50-я гг. XX ст. амерыканскі псіхолаг Джуліан Ротэр заўважыў і канцэптуалізаваў залежнасць паміж разуменнем індывіда самога сябе і ступені паспяховасць уласнай дзейнасці. Калі няўдачы і праблемы тлумачацца выключна знешнімі прычынамі (ад цяжкага дня да татальнага фаталізму ў жыцці), а магчымасці ўласных высілкаў і намаганняў не бяруцца ў разлік, то можна казаць пра экстэрытарыяльны, ці знешні характар кантролю. І наадварот, калі вынікі дзейнасці разглядаюцца як справядлівы і заканамерны працяг асабістых намаганняў, а не збег акалічнасцей, то размова ідзе пра інтэрыяльны, ці ўнутраны характар кантролю.

Канцэпцыя «локус кантролю» – гэта як пошук тлумачэння, дзе знаходзіцца цэнтр матывацыі, ці ў метафарычным сэнсе – «пульт дыстанцыйнага кіравання» ад свядомасці асобы. Д. Ротэр спрабуе паказаць, што ўнутраны ці знешні локус кантролю вызначае больш, чым проста сітуатыўныя паводзіны чалавека. Выбар паміж унутраным ці знешнім локусам кантролю стварае ўстойлівае чаканне справядлівай узнагароды за ўласную працу ці, наадварот, разрывае сувязь паміж уласнымі намаганнямі і заахвочваннем. Гэта магчыма растлумачыць тым, што «у тэорыі сацыяльнага навучання падмацаванне дзейнічае каб умацаваць чаканне таго, што канкрэтныя паводзіны або падзея будуць суправаджацца гэтым падмацаваннем у будучыні» [1, с. 2].

Чаканні – гэта не проста фантазіі ці летуценныя мары, яны маюць вельмі сур'ёзныя наступствы для будучыні тых, хто чакае. Кожная канкрэтная сітуацыя чакання і яе вынік не застаюцца незаўважанымі і пакідаюць свае адбіткі. Чаканні аб'ядноўваюцца, звязваюцца, і на гэтай падставе рана ці позна будзе зроблена выснова адносна магчымай будучыні. Гэта будзе бачна ў стаўленні да разумення сувязі паміж

уласным паводзінамі і іх вынікамі: «Чым больш выразна сітуацыя вызначаецца ўменнем або поспехам у дадзенай культуры, тым меншую ролю такія абагульненыя чаканні будуць адыгрываць у вызначэнні індывідуальных адрозненняў у паводзінах» [1, с. 2]. Калі індывід губляе веру ў свае ўласныя сілы, то і ў паводзінах ён будзе мінімальна адрознівацца ад іншых людзей і імкнуцца зліцца з натоўпам. Гэта вывучаная бездапаможнасць можа праяўляцца на самых розных узроўнях. Але што вельмі істотна для сферы культуры – гэта непасрэдным чынам закранае пытанні ўяўленняў пра будучыню, пра ідэальны стан культуры і месца асобы ў ім. Можа з'явіцца такі тып культуры, калі сувязь паміж актыўнасцю ў мінулым і вынікам у будучыні будзе невідавочнай. «Пасля таго, як у чалавека сфарміравалася ўяўленне аб выпадковасці ці шчаслівым шанцы, эфект падмацавання будзе вар'іравацца ў залежнасці ад таго, якую сувязь ён прыпісвае паслядоўнасці» [1, с. 4]. Існуюць культуры як з чаканнем «птушкі шчасця», так і з культам адданасці прафесіі і шматгадовым удасканальваннем майстэрства. Ці ў адпаведнасці з канцэпцыяй Д. Ротэра культуры, дзе шануюцца адпрацаваныя навыкі, ці дзе ў пашане здольнасць разгледзець шанец ці выцягнуць шчаслівы білет.

Пераход з індывідуальнага на сацыяльны ўзровень у пытанні локуса кантролю паказвае, што гэта не толькі і не столькі вынік індывідуальнай псіхалагічнай дзейнасці, колькі частка аксіялагічнай сістэмы адпаведнай супольнасці. Д. Ротэр даказвае гэта на падставе вынікаў даследаванняў сацыяльнага паходжання студэнтаў, калі прыналежнасць да пэўнай сацыяльнай групы, расы, палітычных перакананняў непасрэдным чынам адбіваецца на этычных і аксіялагічных арыенцірах, у т. л. стаўленні да заслужанага поспеху ці неверагоднага шанцавання. Але падобныя абагульненні і адметнасці не ствараюць універсальную тэорыю ці класіфікацыю, хутчэй «гэта пытанне ступені, а не віду» [2, с. 490] – у якой ступені прадстаўнікі групы разлічваюць на сябе і свае здольнасці, а ў якой – на шчаслівы выпадак.

Калі з улікам наступстваў разумення знешняга і ўнутранага локуса кантролю звярнуцца да пытання канструявання культурнай ідэнтычнасці, то можна сутыкнуцца з нечаканым пытаннем адносна патрэбы ў ёй. Гуманістычнае разуменне чалавека, каштоўнасць асобы і важнасць асветы, не павінны ўводзіць у зман і ствараць ілюзію татальнага жадання ўласнага канструявання ідэнтычнасці як сістэмы адрозненняў. У некаторай ступені гэта сітуацыя падобна на адрозненне паміж разуменнем ідэнтычнасці як стану і як працэсу.

Для чалавека, які кіруецца з дапамогай знешняга локуса кантролю, праблема ідэнтычнасці будзе існаваць у выглядзе атрыманай прыналежнасці да чагосьці. Ніякіх пакут сумлення ў такім разе можа і не быць, таму што будзе адпаведнае перакананне, што ідэнтычнасць не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

залежыць ад індывідуальнай актыўнасці і наступстваў дзеянняў. А для асобы, якая рэфлексуе і бачыць сувязь паміж уласнымі дзеяннямі і вынікамі, якая самастойна калібруе ўнутраны локус кантролю, праблема ідэнтычнасці будзе існаваць у выглядзе бясконцага працэсу. Ідэнтыфікацыя як працэс, які прадугледжвае наяўнасць мэты і матывацыі. Навошта чалавеку прыкладаць дадатковыя намаганні каб ствараць уласную ідэнтычнасць? Чаму недастаткова «проста быць сабой» ці прымаць усё як непазбежнае? Магчыма, адказ існуе ў культурных адрозненнях і аксіялагічных поглядах.

Локус кантролю – гэта заўсёды пра пытанне будучыні, дакладней, пра працу з ёй. Складана ўявіць сабе працэсуальную ідэнтычнасць, якая не прапануе бачання будучыні. Працэс пабудовы ідэнтычнасці не можа падмяняць сабой мэту, для якой людзі ўключаюцца ў яго. Але тут не ідзе размова пра магчымасць кантраляваць будучыню. Усё выглядае больш рэалістычна – магчыма кантраляваць толькі ўяўленні пра будучыню. Кантраляваць не ў рэчаіснасці, а толькі ў свядомасці.

Чаканне будучыні ці набліжэнне яе штодзённымі дзеяннямі, расчараванне ў недастатковым падмацаванні выдаткаваных намаганняў ці карэкцыя рэальнасцю празмерна аптымістычных чаканняў – усё гэта практыкі пабудовы ідэнтычнасці. Належыць да культуры – значыць быць яе творцам. Але творцам не толькі ў сэнсе Культуры (менавіта з вялікай літары), але і на штодзённым узроўні. Культурная ідэнтычнасць можа разглядацца як актыўнае праяўленне локуса кантролю, калі культура з'яўляецца сукупнасцю правіл, а значыць, і сукупнасцю памылак, праблем і недасканаласцей, што выкліканы іх парушэннем. Менавіта разуменне месцазнаходжання локуса кантролю будзе вызначаць практыка перажывання і пераадолення болю памылак і расчараванняў у нясправўджаных чаканнях.

У даследаваннях культурнай ідэнтычнасці магчыма выкарыстоўваць канцэпцыю знешняга і ўнутранага локуса кантролю як аднаго з магчымых вынікаў сацыяльнага навучання асобы, які мае істотны ўплыў на сістэму каштоўнасцей.

1. *Rotter, J.* Generalized Expectancies for Internal Versus External Control of Reinforcement / J. Rotter // Psychological Monographs: General and Applied. – 1966. – Vol. 80. – № 1. – P. 1–28.

2. *Rotter, J.* Internal Versus External Control of Reinforcement: a Case History of a Variable / J. Rotter // American Psychologist. – 1990. – Vol. 45. – № 4. – P. 489–493.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ